# 23 лютага — Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

БДУ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

22 лютага 2005 года, № 4 (1912)



**СВЯТЫ**

***Напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь карэспандэнты "Беларускага універсітэта" наведалі ваенны факультэт — цэнтр ваеннай падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі галоўнай ВНУ краіны.***

***Працэс рэфармавання беларускага войска, які адбываецца з пачатку 90-х, закрануў такую сферу, як ваенная адукацыя. Узнікла аб'ектыўная неабходнасць ажыццяўляць падрыхтоўку кадравых афіцэраў не за межамі краіны, а ў класічных ВНУ Беларусі. Ваенны факультэт стаў структурным падраздзяленнем БДУ.***

***Годам яго нараджэння можна лічыць 2003-і: менавіта тады ваенная кафедра была рэарганізавана ў факультэт і быў праведзены набор на 5 спецыяльнасцей. З гэтага часу падрыхтоўка ваенных спецыялістаў у БДУ якасна змянілася: апрача афіцэраў запасу, тут сталі рыхтаваць кадравых вайскоўцаў. На сённяшні дзень тут вядзецца падрыхтоўка ваенных псіхолагаў, хімікаў, журналістаў, правазнаўцаў і спецыялістаў па міжнародных адносінах у ваеннай сферы. Узначальвае факультэт палкоўнік Уладзімір Міхайлавіч ЛЕЎШЫК.***

# ТУТ РЫХТУЮЦЬ АФІЦЭРАЎ

## ВАЕННЫ ФАКУЛЬТЭТ





Каб паступіць на ваенны факультэт, абітурыенты здаюць не толькі стандартныя ўступныя экзамены, але і нарматывы па фізкультуры (бег на дыстанцыі 1 км і 100 м, а таксама падцягванні) і прафесійныя тэсты, якія дазваляюць выявіць, наколькі шчырае ў абітурыента жаданне стаць ваенным (і далёка не ўсе праходзяць гэты тэст паспяхова).

Курсанты ваеннага факультэта жывуць у добраўладкаванай казарме. З просьбай расказаць пра іх побыт мы звярнуліся да курсанта Дзяніса Пісарэнкі — камандзіра аддзялення, будучага ваеннага журналіста.

Пад'ём у 5.45, за выключэннем нядзелі (у выхадны дазваляецца паспаць да 7 гадзін). Роўна праз 5 хвілін пачынаецца зарадка на плацы. Потым снядання. У 8.00 усім трэба з'явіцца на ранішняе пастраенне. А потым да 18 гадзін — заняткі. У 19.00 усе павінны прыбыць у казарму. У 20.00 пачынаецца вячэра. У 20.30 — прагляд тэлеперадач. Пасля 21.00 — вячэрняя прагулка. Не абысціся і без вячэрняй паверкі, на якой аб'яўляюць заўтрашні нарад (4 чалавекі, якія будуць дзяжурыць: 3 — па роце, 1 — па сталовай), інфармуюць пра загады Міністэрства абароны. Адбой у 21.45. Такі вось распарадак дня.

На ўвесь час навучання курсанты забяспечваюцца ваенным абмундзіраваннем. Не менш за адзін раз на тыдзень курсанты наведваюць лазню.

У нядзелю курсанты могуць схадзіць у адпускную, але, вядома, не ўсе. Дамоў выпраўляюцца па чарзе, згодна з графікам. Тыя, хто застаецца ў казарме ў нядзелю, удзельнічаюць у спартыўных мерапрыемствах. Адпускную можна атрымаць як дадатковае заахвочванне або, наадварот, пазбавіцца яе за правіннасць. З дысцыплінай тут сапраўды вельмі строга: статус абавязвае. Толькі ў такіх умовах можна падрыхтаваць сапраўдных афіцэраў.



*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## СВЯТА АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ Ў БДУ

З нагоды Дня абаронцаў Айчыны 23 лютага ў зале пасяджэнняў Вучонага савета адбудзецца святкаванне. У круглым стале на тэму "Подзвіг народа ў вайне як фактар фарміравання нацыянальнай самасвядомасці" прымуць удзел ветэраны вайны, воіны-інтэрнацыяналісты, выкладчыкі курса "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны", студэнты БДУ. Плануецца ўрачысты марш курсантаў ваеннага факультэта па універсітэцкім дворыку пад гукі духавога аркестра. Да стэлы ў дворыку будуць ускладзены кветкі. Завершыцца святкаванне мастацка-музычнай кампазіцыяй.

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**ХІМІКІ — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ**

Падведзены вынікі зімовай сесіі

Стар. 2

**«ARX» ЗАПРАШАЕ РАЗУМНЫХ**

У БДУ створаны інтэлектуальны клуб

Стар. 3

## НАПІШАМ ЛЕТАПІС ALMA MATER РАЗАМ!

Шаноўныя чытачы!

На вашым факультэце адбываецца штосьці цікавае? У вас прайшлі конкурсы і вечарыны? Пішыце ў "Беларускі універсітэт" — і ўвесь БДУ будзе ведаць пра вас.

Якія тэмы, пытанні, праблемы павінны, на вашу думку, уздымацца на старонках нашай газеты?

Свае прапановы вы можаце даслаць у рэдакцыю па электроннай пошце (gazeta@bsu.by), альбо патэлефанаваць нам (209-53-45).

## З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ХІМІКІ — НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ

***У БДУ падведзены вынікі зімовай сесіі. Як паведаміла начальнік вучэбна-метадычнага аддзела Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Ірына Пятроўна ЛАТУШКА, сярэдняя паспяховасць па выніках зімовай сесіі 2004/2005 навучальнага года склала 83,9 %.***

Гэта амаль столькі ж, як і ў папярэднія гады. Трэба сказаць, што пры гэтым не ўлічваюцца студэнты, якія атрымалі нездавальняючыя адзнакі, і тыя, хто не з'явіўся на экзамены. Яны трапляюць у катэгорыю непаспяховых.

Лепш за ўсё зімовую сесію гэтага навучальнага года здалі хімікі — 91,5 %. Самая нізкая паспяховасць на біялагічным факультэце — 70,8 %. Толькі на «выдатна» ў БДУ вучацца каля 12 % студэнтаў дзённай формы навучання — гэта даволі вялікая частка. Аднак у той жа час 10 % студэнтаў дзённай формы навучання атрымалі нездавальняючую адзнаку.

Паколькі сёлетнія першакурснікі трапілі ў сцены БДУ пасля цэнтралізаванага тэсціравання, цікава будзе прасачыць паспяховасць студэнтаў першага курса. Паспяховасць студэнтаў першага курса не вельмі высокая на такіх факультэтах, як эканамічны (70,4 %), механіка-матэматычны (76,3 %), біялагічны (66,4 %), геаграфічны (80,8%). І гэта пры тым, што агульная паспяховасць студэнтаў гэтых факультэтаў высокая. У цэлым паспяховасць першакурснікаў склала 83,1 %. Што датычыць іншых катэгорый студэнтаў-першакурснікаў, то паспяховасць медалістаў склала 95,8 %, пераможцаў алімпіяд — 95,2%, выпускнікоў ліцэяў — 97,2%, студэнтаў-платнікаў — 71,6 %. Асабліва нізкі працэнт паспяховасці ў студэнтаў, якія вучацца на платным аддзяленні першага курса: напрыклад, на фізічным факультэце — толькі 47,6 %, на механіка-матэматычным — 43,5 %, на біялагічным — 41,3 %, на хімічным — 64,7 %.

**Ганна ЛАГУН**

## СВЯТЫ

# ТУТ РЫХТУЮЦЬ АФІЦЭРАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### АГУЛЬНАВАЙСКОВАЯ КАФЕДРА

Знаёмства з ёю пачалося для нас з цыкла баявога прымянення мотастралковых войск. На нашы пытанні адказваў Аляксандр Марэцкі — не толькі студэнт факультэта філасофіі і сацыяльных навук, але яшчэ і камандзір мотастралковага ўзвода. Нагадаем, што раней на ваенную кафедру прымалі амаль усіх. Цяпер жа, каб патрапіць сюды, трэба прайсці шмат выпрабаванняў. І нават існуе конкурсны адбор. Высветлілася, што каб трапіць на “ваенку”, трэба здаць нарматывы па фізкультуры (прабегчы дыстанцыі 2 км і 100 м, падцягнуцца 15 разоў) і прайсці тэсціраванне, якое ўключае заданні па арыфметыцы (5 хвілін і 100 заданняў), на асацыяцыі і раскладкі з арыгамі.

Навучанне на агульнавайсковай кафедры складаецца з двух узроўняў падрыхтоўкі на III і IV курсе. Пасля першых 2 семестраў усе навучэнцы здаюць экзамен на званне сяржанта. На другі ўзровень пераходзяць не ўсе — толькі тыя, хто найбольш праявіць сябе. Ім давядзецца паўгода служыць у войску ў званні лейтэнанта, і яны стануць афіцэрамі запасу.

А пакуль яны набываюць неабходныя веды: праходзяць тактычную, страявую, тапаграфічную, агнявую, медыцынскую, інжынерную падрыхтоўку. Заняткі праводзяцца метадам ваеннага дня — адзін раз у тыдзень. Студэнтаў аб'ядноўваюць па групах у залежнасці ад спецыяльнасці: філосафаў і філолагаў прызначаюць у пяхоту, матэматыкі заўсёды становяцца артылерыстамі (яны падрабязна вывучаюць балістыку, робяць усе неабходныя разлікі), эканамісты звычайна займаюцца проціпаветранай абаронай.

Набытыя тэарэтычныя веды абавязкова замацоўваюцца на практыцы: палявыя вучэнні запланаваны на красавік. Маладых байцоў будуць вучыць правільна весці бой — наступаць і абараняцца, страляць і рабіць акопы. Кожнага хлопца з мотастралковага ўзвода абавязкова навучаць вадзіць БМП (баявую машыну пехоты). Дарэчы, практычнае навучанне ўключае выкананне абавязковых нарматываў: напрыклад, трэба разабраць кулямёт за 7 секунд, а яшчэ паспець зрабіць акоп пры дапамозе сапёрнай рыдлёўкі за 10 хвілін. Задача не з самых лёгкіх, але, як жартуе Аляксандр, пры пагрозе акопваешся вокамгненна.

Ёсць тут і свой слэнг: форму, напрыклад, называюць “зялёнка” і “афганка”. У “афганцы” студэнты, якія наведваюць агульнавайсковую кафедру, займаюцца ў полі. Вонкаваму віду будучага вайскоўца ўвогуле надаецца асаблівая ўвага: джынсы, упрыгажэнні накшталт завушніц, нестандартная прычоска не дапускаюцца. Стрыжка павінна быць акуратнай, ёсць нават пэўныя ўзоры. Яны падаюцца на фотаздымках, размешчаных на першым паверсе.

**Віншуем са святам!**
**Удалай службы!**

**Ала МАЧАЛАВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі**
**Фотаздымкі з архіва ваеннага факультэта**

### УСЁ ПА-ДАРОСЛАМУ

***Ваенны факультэт — адзін з самых незвычайных і цікавых у нашым універсітэце. Цікавы ён хаця б тым, што толькі тут студэнты займаюцца ў форме — ваеннай. На пытанне, як курсанты ставяцца да формы, адзін з іх, Аляксандр, адказаў:***

— Форма ператварае хлопца ў мужчыну. Спачатку было нязвыкла і нязручна, а часам і няёмка, а цяпер я з ёй амаль не расстаюся.

**— З дысцыплінай цяжка было звыкнуцца?**

— Я ведаў, куды іду. У мяне ўся сям'я — ваенныя, таму з самага маленства я быў прывучаны да дысцыпліны. Некаторым курсантам такое становішча здавалася спачатку няправільным, але цяпер і яны прызвычаіліся.

**— А якое стаўленне да дзяўчат-ваенных?**

— Найлепшае. Вельмі добра, што дзяўчаты калі-нікалі цікавяцца мужчынскімі справамі — не ўсё ж ім спадніцы перакройваць ды раманамі зачытвацца.

**— Ці ёсць для іх якія-небудзь ільготы?**

— Не, тут усе роўныя. Але, шчыра кажучы, у сталоўцы мы ім усё ж такі саступаем.

**— Як вы адзначаеце свята на факультэце?**

— Вельмі проста — гэта ж не дзіцячы садок, а амаль што войска, дзе ўсё сур'ёзна, па-даросламу, калі хочаце.

Вось такія яны, будучыя афіцэры, — сур'ёзныя і памяркоўныя. Але не паспела я адысціся пасля гутаркі, як курсанты, адчуўшы свабоду па-за межамі факультэта, пачалі гуляць у снежкі і гарэзліва смяяцца. Зрэшты, хто ведае — можа, гэта таксама частка навучальнага працэсу: рэпетыцыя вайсковых дзеянняў і адпрацоўка тактычных хадоў?..

**Кацярына КУРАЧОВА,**
**студэнтка факультэта журналістыкі**

## ГОСЦІ

**15 лютага** ў гасцях у нашага універсітэта былі прадстаўнікі Мінскага міжнароднага клуба жонак паслоў і дыпламатаў. Яны пазнаёміліся з тым, чым жыве БДУ, адбылася сустрэча з рэктарам прафесарам В.І. Стражавым.

**16 лютага** наш універсітэт наведала дэлегацыя Усеагульнага саюза жанчын Сірыі. Яны наведалі музей землязнаўства, выставу навукова-тэхнічных дасягненняў БДУ, навучальныя аўдыторыі і навуковыя лабараторыі фізічнага факультэта. Гэта першы візіт прадстаўніц Усеагульнага саюза жанчын Сірыі ў нашую краіну.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**
**Фотаздымкі Генадзя КРАСКОЎСКАГА**



**На фотаздымку: госці з Сірыі ў музеі землязнаўства**

## СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НАВУЧАННЕ В'ЕТНАМСКІХ СТУДЭНТАЎ У БДУ

***У лютым 2005 г. паміж БДУ і універсітэтам горада Х'юэ (Сацыялістычная Рэспубліка В'етнам) быў падпісаны чарговы Дагавор аб супрацоўніцтве.***

У ім прадугледжана сумеснае навучанне в'етнамскіх студэнтаў і аспірантаў па наступных спецыяльнасцях: тэарэтычная фізіка, лазерная фізіка, спектраскапія, фізіка цвёрдага цела, ядзерная фізіка, матэматычны аналіз, алгебра, тэорыя імавернасцяў, інфарматыка. Згодна з умовамі дагавора на працягу 5 гадоў БДУ будзе прымаць на кантрактнай аснове 20 студэнтаў і 10 аспірантаў, якія прайшлі спецыяльны адбор і пачатковае навучанне на рускай мове ў Х'юэскім універсітэце, для завяршэння навучання.

Універсітэт горада Х'юэ — адзін з найстарэйшых партнёраў БДУ: гісторыя нашых узаемаадносін налічвае каля 20 гадоў. Яшчэ ў 1980 г. паміж нашымі універсітэтамі быў падпісаны Дагавор аб навуковым і культурным супрацоўніцтве. Апошні па часе візіт дэлегацыі в'етнамскага універсітэта ў БДУ адбыўся ў чэрвені 2004 г.: тады абмяркоўвалася аднаўленне супрацоўніцтва і магчымасць падрыхтоўкі ў нас спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі з В'етнама.

**Па інфармацыі ўпраўлення па міжнародных сувязях**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

Семінар-практыкум педагагічных работнікаў студэнцкага гарадка “Асаблівасці інфармацыйнага і ідэалагічнага забеспячэння выхаваўчай работы ў студэнцкіх інтэрнатах БДУ” адбыўся 15 лютага ў канферэнц-зале інтэрната № 2.

• • • • • • • • • • •

Традыцыйны шоу-конкурс “Супермэн — 2005” адбудзецца 24 лютага ў сталовай інтэрната № 5 (вул. Кастрычніцкая, 4). Пачатак у 19.00.

• • • • • • • • • • •

Літаратурна-музычная гасцёўня “Натхненне” адчыніць свае дзверы 25 лютага ў канферэнц-зале інтэрната № 2 у 19.00. Яе тэма “Сустрэча з паэтамі-ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны”.

• • • • • • • • • • •

Навучальны семінар для студэнцкага актыву БДУ “Сацыяльнае ўзаемадзеянне” пройдзе 25—27 лютага на базе САК “Брыганціна”.

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# СТУДЭНТЫ НА ЭСТРАДЗЕ

***21—22 лютага ў БДУ праходзяць адборачныя туры фестывалю эстрады.***

Такі фестываль ладзіцца ў нашым універсітэце ўжо трэці год. Ён быў арганізаваны, каб выявіць новыя кірункі сучаснай маладзёжнай творчасці, а таксама стымуляваць творчую актыўнасць студэнтаў. Па словах загадчыцы культурна-масавага аддзела ўпраўлення па справах культуры Аксаны Пятроўны Чупрынай, студэнты будуць удзельнічаць у 5 намінацыях: "Танец", "Песня", "Музыка", "Размоўны жанр", "Арыгінальны жанр". У праграме факультэта павінна быць не менш за тры нумары па гэтых кірунках.

Мэта адборачнага тура — не дапусціць да ўдзелу ў фестывалі нумары з недастатковым выканальніцкім, этычным і эстэтычным узроўнем, а таксама нумары, якія не ўваходзяць у фарматныя рамкі мерапрыемства.

Канцэртныя праграмы факультэтаў, якія пройдуць папярэдні адбор, будуць удзельнічаць спачатку ў першым туры Фестывалю эстрады БДУ 2—3 сакавіка, а пазней і ў гала-канцэрце 18 сакавіка.

**Ганна ЛАГУН**

## ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# ДЗЕ АТРЫМАЦЬ СКІДКІ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

**Музей Вялікай Айчыннай вайны** (прасп. Ф. Скарыны, 25а, тэл. 227-56-11): бясплатнае наведванне.

**Музей нацыянальнай гісторыі і культуры Беларусі** (вул. К. Маркса, 12, тэл. 227-43-22): бясплатнае наведванне экспазіцыі, скідкі 50 % пры наведванні выставы.

**Музей прыроды і экалогіі** (вул. К. Маркса, 12, тэл. 206-69-56): бясплатнае наведванне.

**Літаратурны музей Янкі Купалы** (вул. Я. Купалы, 4, тэл. 227-78-66): бясплатнае наведванне.

**Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа** (вул. Акадэмічная, 5, тэл. 284-19-40): бясплатнае наведванне.

**Палац воднага спорту** (вул. Сурганава, 2а, тэл. 280-13-08): скідкі 50 % да 15.00 (45-хвілінны сеанс у басейне абыдзецца ў 2800 руб.).

**Боўлінг-цэнтр "Madison"** (вул. Ціміразева, 9, тэл. 226-49-03): скідкі 50 % да 17.00.

**Більярдная "Шчаслівы ўдар"** (вул. Кальварыйская, 1, тэл. 226-49-03): скідкі 50 % да 15.00.

**Інтэрнэт-кавярня "Купалаўскі"** (прасп. Ф. Скарыны, 25, пакой 118, тэл. 227-39-60).

**Падрыхтавала Ала МАЧАЛАВА**

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# «ARX» ЗАПРАШАЕ РАЗУМНЫХ

***Семінар на тэму "Міжнародны тэрарызм як інструмент глабальнага кіравання" адбыўся 15 лютага. Арганізавалі яго студэнты факультэта міжнародных адносін, аб'яднаныя ў інтэлектуальны клуб "Arx".***

Правялі мерапрыемства студэнты ФМА Юрый Царык, Ілля Касьяненка, Дзяніс Брыгадзін і Дзмітрый Суслаў. Мэта семінара — абвергнуць афіцыйную версію падзеяў 11 верасня 2001 г. і падрыхтаваць базу для аналізу канцэпцыі міжнароднага тэрарызму. Удзел у яго працы прынялі больш за 150 студэнтаў. На семінары былі паказаныя дакументальныя кадры — афіцыйная і неафіцыйная хроніка падзеяў, шматлікія фатаграфіі і сведчанні відавочцаў.

Ідэя стварэння клуба з'явілася яшчэ ў 2003 г. Два студэнты ФМА — Юрый Царык і Ілля Касьяненка вырашылі, што сумна і недапушчальна жыць без вялікай ідэі. Задума была ў тым, каб скалаціць каманду разумных маладых людзей, якая б зрабіла свой унёсак у вырашэнне тых праблем, якія стаяць перад беларускім грамадствам. 21 лютага 2004 г. адбыўся першы сход клуба. А афіцыйны статус ва універсітэце клуб набыў у студзені 2005 г.

Назва "Arx" была абраная не выпадкова. У перакладзе з латыні яно азначае "крэпасць", "акропаль", "умацаваная частка горада". Для сяброў клуба яно мае два значэнні. З аднаго боку, яно ў нейкай ступені адлюстроўвае становішча сучаснай Беларусі, якая (адна з нямногіх дзяржаваў) захоўвае прыхільнасць да традыцыйных каштоўнасцяў. З другога боку, назва адлюстроўвае і сутнасць самой арганізацыі, якая таксама прытрымліваецца гэткіх каштоўнасцяў і імкнецца ўвасобіць іх у жыццё.

За год актыўнай працы былі наладжаны шчыльныя кантакты з супрацоўнікамі інфармацыйна-аналітычнага рэсурса "Інтэрнэт супраць тэлеэкрана" (www.contr-tv.ru), з дэпутатам расійскай Дзярждумы Сяргеем Глазьевым (www.glazev.ru) і дэпутатам Вярхоўнай Рады Украіны Юрыем Саламаціным. Было наладжана супрацоўніцтва з Беларускім фондам міру, Адукацыйным цэнтрам БДУ і Цэнтрам міжнародных адносін БДУ. Увесну 2004 г. была арганізаваная публічная лекцыя С.Г. Кара-Мурзы, праведзены першы адкрыты семінар клуба, прысвечаны тэхналогіям сеткавых войнаў. Увосень сябры клуба ўзялі інтэрв'ю ў рускага філосафа і пісьменніка А.А. Зіноўева.

**Інтэлектуальны клуб "Arx" запрашае ўсіх ахвотных да супрацоўніцтва. Больш падрабязную інфармацыю пра клуб можна даведацца на сайце www.arx.by (e-mail: arx@arx.by).**

**Вольга ЯРАШ**

## ВАНДРОЎКІ

# УНІВЕРСІТЭТ ДЛЯ САНТЭХНІКА

***Вельмі часта людзі нават не ведаюць, з якімі цікавымі людзьмі яны побач жывуць, размаўляюць, абмяркоўваюць надзённыя праблемы.***

***Адзін з маіх сяброў, першакурснік факультэта міжнародных адносін Анатоль МАШКОЎ вырашыў пачаць сваю прафесійную кар'еру, не чакаючы атрымання дыплома. Адразу пасля паспяховай здачы зімовай сесіі ён накіраваўся ў Францыю, дзе правёў выдатныя канікулы, якія яшчэ надоўга застануцца ў яго памяці. Падарожжа пакінула ў Толі незабыўныя пачуцці і эмоцыі, якімі ён згадзіўся са мной і з вамі падзяліцца.***

**— Як арганізоўвалася паездка?**

— Арганізатарам гэтай паездкі з'яўляецца такая арганізацыя, як ARASFEK. Яна фінансуецца французскім бокам. Французы запрашаюць да сябе маладых людзей з Усходняй і Паўднёвай Еўропы: Балгарыі, Румыніі, Беларусі. А ў гэтым годзе ў мерапрыемствах быў задзейнічаны і наш факультэт. Удзел у паездцы прымалі маладыя людзі (IV—V курсы), якія валодаюць французскай мовай. Францыя брала на сябе выдаткі: мы не плацілі за візу, экскурсіі. Супрацоўнікі ARASFEK дамовіліся таксама з людзьмі, якія прымалі нас і ў якіх мы гасцявалі. Такім чынам, мы аплацілі толькі дарогу і паслугі гідаў (напрыклад, гіда, які паказаў нам Парыж).

**— Наколькі гэтая праграма дапамагла табе ў далейшым навучанні?**

— Палепшыліся навыкі валодання французскай мовай. Нам даводзілася размаўляць на французскай, бо рускай і беларускай, зразумела, яны не ведалі. Былі выпадкі, калі людзі, якія прымалі нас, нават забаранялі нам карыстацца іншай мовай, акрамя французскай, паміж сабой. Яны нават вывучылі адну фразу па-руску: "Перестаньте разговаривать по-русски", — каб нам больш зразумела было.

**— А ці кантактавалі вы з французскімі студэнтамі?**

— Там студэнты не такія, як у нас. У Гапе, дзе мы былі, ёсць універсітэт, дзе рыхтуюць лыжных інструктараў. Увогуле, там вучаць усім прафесіям, якія звязаны з гарамі. Калі б гэта было ў Беларусі, то гэта быў бы дыплом аб сярэдняй адукацыі. Разумееш, у тым жа Гапе ёсць універсітэт, у якім рыхтуюць сантэхнікаў, аўтаслесараў...

**— А ці ведаюць там, дзе знаходзіцца Беларусь?**

— Не, не кожны гэта ведае. Мы казалі: "Гэта краіна, якую праяджаеш, калі едзеш з Еўрапейскага Саюза ў Расію". Мы гутарылі з братам гаспадыні, і ён пытаўся: "А што такое Беларусь?" Мы адказвалі: "Ну, ведаеце, гэта дзяржава, якая мяжуе з Польшчай, Украінай, Расіяй, Прыбалтыкай..." — "А! Гэта нешта такое каля Эстоніі?" Я кажу: "Не, там Латвія". — "А, напэўна, гэта пад Латвіяй?" — "Не, там Літва. Гэта тое, што большае..." Потым мы ўзялі карту, і я паказваю: "Вось, бачыце, наша краіна". — "О! А я і не заўважаў. Яна такая вялікая..." І яшчэ там такая думка пануе, што ў нас тут Савецкі Саюз...

**— А як там ставяцца да сваёй гісторыі?**

— Яны вельмі і вельмі цікавяцца сваёй гісторыяй і дасканала яе ведаюць. Калі я сказаў, што мяне вельмі цікавіць гісторыя, а ў прыватнасці Карл Вялікі, яны адразу мне сказалі стагоддзе, у якім той жыў, што зрабіў, у якім годзе ён прыняў хрысціянства, адразу сказалі, хто была яго жонка. Вось калі мы размаўлялі пра Напалеона, высветлілася, што яны дакладна ведаюць дзяржаўны кодэкс 1804 года. Да таго ж яны вельмі цікавяцца паходжаннем назваў сваіх населеных пунктаў.

**— Што ты прывёз з гэтай паездкі?**

— Я прыдбаў вялікую павагу да Францыі. Мне вельмі падабаецца, што яны спрабуюць зрабіць з Еўропы адзін вялікі дом.

**Гутарыў Аляксандр СЕРЖАНОВІЧ, студэнт факультэта журналістыкі**

## КАНФЕРЭНЦЫІ

# ПЕРШЫ КРОК У НАВУКУ

***Канферэнцыя школьнікаў па матэматыцы, інфарматыцы, фізіцы, астраноміі, хіміі, біялогіі і экалогіі ў рамках конкурсу "БелЮніёр" адбылася 19 лютага ў ліцэі БДУ. У журы конкурсу ўвайшлі выкладчыкі ВНУ Беларусі.***

Конкурс "БелЮніёр" — адзін з 500 рэгіянальных конкурсаў Сусветнага агляду навуковай і інжынернай творчасці навучэнцаў (Intel International Science and Engineering Fair, скарочана Intel ISEF), які праводзіцца ў Беларусі ў шосты раз. Дзякуючы спонсарскай падтрымцы прадстаўніцтва карпарацыі Intel у краінах СНД і Балтыі сёлета аўтары трох найлепшых работ атрымаюць магчымасць паказаць свае вынікі на фінальным аглядзе ў г. Фінікс (ЗША) з 8 па 14 мая. Штогод на гэты агляд прыязджаюць больш за 1200 удзельнікаў з усіх штатаў ЗША і 40 краінаў свету, каб прадставіць свае работы па 15 дысцыплінах. Дадатковую інфармацыю можна знайсці ў Інтэрнэце (www.sciserv.org/isef, e-leam.lyceum.bsu.by).

Нашую краіну ў ЗША будуць прадстаўляць адзін камандны і два персанальных праекты. У галіне фізікі найлепшым прызнаны праект Алены Абрамавай і Ганны Мухортавай (ліцэй БДУ) "Хвалі на паверхні вады". У сферы астраноміі перамог праект "Гравітацыйная мадэль змянення траекторый галактычных джэтаў у радыёгалактыцы 3С 31" Аляксея Казлоўскага (ліцэй БДУ). Трэцім пераможцам стаў Уладзімір Буры (СШ № 95 г. Мінска) з праектам па экалогіі "Комплексны маніторынг стану драўняных парод ва ўмовах горада з выкарыстаннем батанічных і хімічных метадаў".

**Іван ФЕДАРОВІЧ**

## АБ'ЯВЫ

# ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА БДУ

28 лютага адбудзецца пасяджэнне Вучонага савета БДУ. Асноўная тэма — "Вынікі навукова-даследчай работы БДУ за 2004 год". З дакладам выступіць першы прарэктар прафесар Сяргей Кімавіч Рахманаў. Мерапрыемства пройдзе ў будынку рэктарата ў зале пасяджэнняў Вучонага савета (вул. Бабруйская, 5а). Пачатак у 10.15.

# РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

***аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:***

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: сістэмнага аналізу, глебазнаўства і геалогіі, банкаўскай і фінансавай эканомікі, іудаікі, тэарэтычнай фізікі;

**ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ** беларускай літаратуры і культуры;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ**: сістэмнага аналізу, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, філасофіі і метадалогіі навукі, гісторыі беларускай літаратуры, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, гісторыі паўднёвых і заходніх славян, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: нямецкага мовазнаўства, раманскіх моў, іудаікі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ**: сацыялогіі, замежнай літаратуры, славянскіх літаратур, іудаікі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў;

**АСІСТЭНТА** кафедры тэарэтычнай фізікі.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, Белдзяржуніверсітэт, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

# ІНСТЫТУТ ЯДЗЕРНЫХ ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

***аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:***

лабараторыя гама-оптыкі: **ЗАГАДЧЫК ЛАБАРАТОРЫІ** (1 чалавек).

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 11, аддзел кадраў, пакой 315, тэл. 226-42-31.**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

***Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ прадстаўляе чытачам «Беларускага універсітэта» новыя кнігі, выдадзеныя ў БДУ.***

*Т.І. Адамович.* **Экономическая история.** У дапаможніку на аснове шэрага аўтарскіх навуковых распрацовак і вопыту выкладання эканамічнай гісторыі раскрываюцца спосабы фарміравання эканоміка-гістарычнага мыслення студэнтаў праз прадмет, метад, перыядызацыю і ў матэрыяле эканамічнай гісторыі.

**Системы телекоммуникаций и компьютерные сети.** *Автор-составитель Г.Ф. Астапенко.* У навучальным дапаможніку разглядаюцца тэлекамунікацыйныя сістэмы і аналізуюцца асноўныя напрамкі іх развіцця.

*В.М. Юрин, С.Н. Найдун.* **Минеральное питание растений.** Навучальны дапаможнік разглядае пытанні мінеральнага харчавання раслін з улікам дасягненняў сучаснай навукі. Асаблівая ўвага надаецца механізмам траплення элементаў у клетку і падтрымання ўнутрыклетачнага гамеастазу, а таксама рэгуляцыі транспарту мінеральных рэчываў у цэлай расліне.

**Белорусский государственный университет: Кафедра — ключевое звено качества университетского образования.** *Под общей редакцией О.А. Яновского.* У зборнік увайшлі артыкулы і тэзісы ўдзельнікаў аднайменнага навукова-метадычнага семінара, які адбыўся ў чэрвені 2003 г.

*Ю.С. Харин, В.И. Малюгин, А.Ю. Харин.* **Эконометрическое моделирование.** Навучальны дапаможнік з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь — першы айчынны камп'ютарны практыкум па эканаметрыцы. У ім змяшчаюцца больш за 100 заданняў па ўсіх асноўных раздзелах эканаметрыкі, а таксама мадэлі, метады, алгарытмы і метадычныя ўказанні, неабходныя для іх выканання ў рамках лабараторных заняткаў на камп'ютары.

*А.И. Хмельницкий, Н.В. Василевская, С.Н. Черенкевич.* **Структура и свойства ионных каналов биологических мембран.** У дапа-




можніку разглядаюцца пытанні развіцця тэарэтычных уяўленняў пра механізмы пераносу іёнаў, эксперыментальныя метады даследавання ўласцівасцяў каналаў, падаюцца сучасныя звесткі пра структуру каліевых, кальцыевых, натрыевых і хлорных каналаў.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ШЧАСЦЕ НА "СЁМЫМ НЕБЕ"

Прыгожыя статныя дзяўчаткі пакрыху збіраліся ля актавай залы галоўнага корпуса БДУ. Сёння яны ўпершыню за гэты год прыйшлі на рэпетыцыю.

— Зачынена, таму яшчэ і не пачалі працаваць,— адказалі яны на пытанне кіраўніка, які прыпазніўся.

Апынуўшыся ў зале, дзяўчаты, нікога не саромеючыся (пад час канцэртаў і не такое бывае), пачалі пераапранацца ў спартыўную форму і ператварацца ў працоўны шоу-балет.

Вы верыце ў нумералогію? А ў таямнічае значэнне лічбы "сем"? Па сакрэце кажучы, танцавальны калектыў "Сёмае неба" некалі зваўся "Шчаслівай сямёркай". Але хутка ўдзельнікам надакучыла тлумачыць, чаму ж іх на сцэне не сем, а звычайна больш. Прыйшлося змяніць назву. Здаецца, "Сёмае неба" гучыць не горш?

Дзіўна, але кіраўнік гэтага шоу-балета — Алег Тарасаў — не мае спецыяльнай адукацыі. На самой справе ён прадстаўнік аднаго з самых жудасных прафесій — доктар-стаматолаг. У цяперашнім Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце Алег вучыўся рабіць тыя ж "брэкеты" да будаваць масты ў роце. Студэнт не будзе сапраўдным студэнтам, пакуль ён усюды сябе не паспрабуе. Таму і займаўся Алег у творчым калектыве "Тэлеос". Заўжды прыемна рабіць любімую справу, асабліва калі яна праходзіць праз усё тваё жыццё. Вось і застаўся Алег, як зараз кажуць, у шоу-бізнесе.

Набраць сабе гурт для сумеснай працы ў нашы дні зусім няцяжка: жадаючых на кастынгі праходзіць шмат. Усе праблемы пачынаюцца, калі нехта з ужо добра згуртаванага калектыву вырашае ажаніцца або завесці дзіця. Яны адразу пачынаюць адчуваць недахоп часу на што-небудзь іншае, акрамя сям'і. Каб знайсці новых людзей, патрабуюцца час і шмат намаганняў. Бывае, нумар, на які са "старым" саставам пойдзе 40 хвілін падрыхтоўкі, з новым вучыш амаль тыдзень (а то і больш).

Грошы, грошы, грошы.... Само слова звініць, нібы паўпустая скарбонка. Усюды патрэбны грошы. Новы чалавек — новы памер адзення — грошы. Больш цікавае выступленне — шмат аксесуараў — зноў грошы. А што рабіць калектыву на самаакупнасці?

**За час свайго танцавальнага стажу калектыў "Сёмае неба":**

**у 2003 г. заняў першае месца на Чэмпіянаце Рэспублікі Беларусь па танцы жывата ў намінацыі "малая група";**

**у 2002 г. стаў лаўрэатам IV фестывалю выканаўцаў эстраднай песні і танца "Белая Русь";**

**атрымаў грамату ад 120-й гвардзейскай Рагачоўскай мотастралковай дывізіі за "высокае сцэнічнае майстэрства" і вялікую работу па выхаванні воінаў гэтай дывізіі.**




Часам дапамагае родны БДУ, але ж, як усім вядома, матэрыяльная база беларускіх ВНУ досыць сціплая.

1997 год. Фестываль "Філіпс". На сцэне ля Палаца спорту выступаюць расійскі гурт "Брава", каманда КВЗ ад БДУ і "Шчаслівая сямёрка". Тут іх і заўважае Сяргей Турбан. Так БДУ пачаў клікаць "Сямёрку" на святы спачатку як гасцей, а потым і ўвогуле прапанаваў супрацоўнічаць. Вось і "пасяліўся" наш шоу-балет ва ўпраўленні па справах культуры БДУ.

Калі не шчасце, то смех і жарты ад "Сёмага неба" вы атрымаеце ў падарунак заўжды. Іх выступленні не праходзяць без здарэнняў. Некалькі год таму ў рэпертуары шоу-балета быў танец у масках а-ля Майкл Джексан. Паводле задумы, напрыканцы песні Алег Тарасаў павінен скокнуць у натоўп людзей, каб крышку "папужаць" іх. Скокае, пужае — нейкая прыгажуня ад страху хапаецца за хлопца, які стаяў побач і таксама напужаўся. Хутка яны ажаніліся і былі ад шчасця на "сёмым небе".

**Алёна КРЫЎКІНА**

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# SCRIPTOR UNIVERSITATIS

Пэўна, вам ужо сустракаліся кнігі РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», упрыгожаныя віньеткай у выглядзе герба нашай alma mater і надпісам-назовам кніжнай серыі "Scriptor universitatis". Лацінскія словы абазначаюць "універсітэцкі аўтар", а серыя названа так, каб падкрэсліць, што праз выдавецкую дзейнасць можна ўвасобіць у жыццё асветніцкую, агульнагуманітарную функцыю універсітэта.

Серыя аб'ядноўвае унікальныя работы універсітэцкіх навукоўцаў, самыя цікавыя даследаванні ў розных галінах ведаў. Выданні стануць запатрабаванымі як сярод спецыялістаў, так і аматараў. Выдавецтва лічыць сваім абавязкам вяртаць з архіваў самыя цікавыя гістарычныя матэрыялы.

Серыя "Scriptor universitatis" заснавана ў 2003 г. У ёй ужо выйшла 5 кніг. Першая — унікальнае выданне рапарта, пададзенага Напалеону начальнікам яго контрразведкі, польскім генералам, былым вышэйшым афіцэрам "літоўскай арміі" Міхалам Сакальніцкім з рэкамендацыямі "пра спосабы выбаўлення Еўропы ад уплыву Расіі" (укладанне, прадмова і заўвагі А.А. Яноўскага). Гэта найкарыснейшая і найкаштоўнейшая крыніца дакументальна зафіксаванай інфармацыі для прафесійных гісторыкаў, бо друкуецца ўпершыню.

Другая кніга серыі — ілюстраванае навукова-папулярнае выданне гісторыі Беларусі першабытнага перыяду Міхаіла Міхайлавіча Чарняўскага "Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі". Гэта выданне, багатае на малюнкі і фотаздымкі археалагічных матэрыялаў, аздоблена картамі, схемамі і сучаснымі рэканструкцыямі. Кніга адрасуецца ў першую чаргу вучням школ і ліцэяў.

Падарункам аматарам айчыннай гісторыі сталася кніга з працамі першага рэктара БДУ, аднаго з арганізатараў Інбелкульта і НАН Беларусі Уладзіміра Іванавіча Пічэты. У кнігу ўвайшлі працы, якія не перавыдаваліся з часу іх першага выхаду ў свет: "Гісторыя беларускага народа" і "Гісторыя Літоўскай дзяржавы да Люблінскай уніі". Адрасуецца яна выкладчыкам гісторыі, студэнтам, а таксама тым, хто цікавіцца жыццём і навуковай спадчынай У.І. Пічэты. Выданне было прымеркавана да 125-годдзя з дня нараджэння выдатнага навукоўца-гісторыка.

Удалай з пазіцыі навуковай і паліграфічнай якасці можна назваць манаграфію П.І. Брыгадзіна і А.М. Лукашэвіча "Ваенная школа ў Беларусі". Гэта захапляльны расповед пра станаўленне ваеннай школы ў Беларусі ад часоў Рэчы Паспалітай да стварэння сеткі ваенна-навучальных устаноў у Расійскай імперыі. Кніга адрасуецца тым, хто займаецца патрыятычным выхаваннем моладзі, цікавіцца ваеннай гісторыяй.

"Беларусь і Літва. Гістарычныя лёсы Паўночна-Заходняга краю" — перавыданне кнігі, апублікаванай П.М. Бацюшкавым у 1890 г. Доўгі час яна лічылася адной з фундаментальных прац, прысвечаных царкоўнай, ваеннай і палітычнай гісторыі Беларусі ад найстаражытнейшых часоў да XIX ст. Кніга разлічана на гісторыкаў, аспірантаў і аматараў гісторыі.

Хутка будзе надрукавана яшчэ адна надзвычай цікавая работа У. І. Пічэты "Гісторыя Беларусі".

**Аляксандр ТРУШКО**

СПОРТ

## БДУ НА УНІВЕРСІЯДЗЕ

***Першынство ВНУ Беларусі па лёгкай атлетыцы ў рамках рэспубліканскай універсіяды адбылося 11—13 лютага ў Мінску.***

***Больш за 400 спартсменаў прадстаўлялі 26 вышэйшых навучальных устаноў краіны. Даволі паспяхова выступілі на турніры прадстаўнікі БДУ.***

У спаборніцтвах па бегу сярод мужчын на дыстанцыях 200 м і 400 м не было роўных студэнту БДУ А. Елістратаву. А ў эстафеце 4 па 200 м зборная нашага універсітэта заняла другое месца.

У жанчын выдатных поспехаў дабіліся Т. Галаўнёва, якая заняла першае месца ў скачках у вышыню, і В. Ганчарэнка, якая здолела далей за ўсіх кінуць ядро. Таксама добры вынік паказала В. Варабей. Дзяўчына заняла трэцяе месца ў бегу на 400 м.

Наступны этап універсіяды адбудзецца ў сакавіку. На 10—13 сакавіка запланаваны спаборніцтвы лепшых спартсменаў-лыжнікаў. Пра тое, як пакажуць сябе прадстаўнікі БДУ, чытайце ў наступных нумарах "Беларускага універсітэта".

**Аляксандр САЛАМАХІН**

## СПАРТАКІЯДА Ў РАЗГАРЫ

***Пасля перапынку, выкліканага зімовай сесіяй і канікуламі, зноў набіраюць абароты спаборніцтвы студэнтаў у праграме спартакіяды. Вельмі насычанымі павінны стаць апошнія спартыўныя дні лютага, а таксама пачатак вясны.***

Турнір па валейболе сярод жанчын пачаўся 15 лютага. Хоць пакуль што адбыліся толькі першыя матчы, яны ўжо выклікалі цікаўнасць у гледачоў. Многія студэнты прыходзяць у спартыўныя залы, каб пабалець за зборную свайго факультэта.

Сінхронна стартуюць спаборніцтвы па двух даволі розных відах спорту: 21 лютага пачынаюцца чэмпіянаты па баскетболе і шахматах. Кожны можа выбраць для сябе сам, што яму бліжэй.

А на 22 лютага запланавана правядзенне лыжных гонак. Усе жадаючыя паназіраць за ходам турніру могуць сабрацца ў гэты дзень у парку імя Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**Аляксандр САЛАМАХІН**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

22 лютага 2005 года
Падпісана да друку 21.02.2005 г.
Зак. 201. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by